цыйныя адносіны): «Таня, не змаўкаючы, усё расказвала Міфодзю пра маці» (І.Пташнікаў). На пісьме А.ч.с. выдзяляюцца коскамі, радзей — працяжнікамі. *Т.Ф.Рослік.*

**АДАШКЕ́ВІЧ** Сяргей Аляксандравіч (9.9.1918, в. Перацяткі Дзяржынскага р-на — 25.8.2007), беларускі скульптар. Вучыўся ў Віцебскім маст. тэхнікуме (1935—37), Горкаўскім маст. вучылішчы (1939—41). Працы ў галіне станковай і манумент. скульптуры. Для яго работ характэрны кампазіцыйная закончанасць, дакладнасць трактоўкі і мяккасць святлоценявой мадэліроўкі формы: «1941 год» (1958), «Геолаг» (1963), партрэты «Рыма Шаршнёва» (1964), «А.Гаравец» (1974), «Ленін-гімназіст», «Мікалай Судзілоўскі-Русель» (абодва 1981) і інш. Аўтар помнікаў ахвярам фашызму ў в. Дражна (1964), воінам і партызанам, загінуўшым у Вял. Айч. вайну, у в. Церабуты (1968; абодва ў Старадарожскім р-не), **Ф.**Скарыне ва ўнутраным дворыку БДУ у Мінску (1990). Удзельнічаў у дэкар. афармленні будынкаў суvotораўскага вучылішча, Гал. паштамта, Нац. маст. музея Рэспублікі Беларусь, дамоў на Прывакзальнай пл. ў Мінску.

**АДБІ́ТАК**, атрыманыя з друкарскай формы тэкст, графічная інфармацыя на паперы, кардоне і інш. матэрыяле; закончаны твор маст. графікі. Адрозніваюць А. пробныя (для кантролю якасці ці ацэнкі зробленых папраўак і дапаўненняў) і тыражныя (прадукцыя, якая атрымліваецца з друкарскага станка).

**АДВА́ЖНЫ** Вінцук (сапр. Г е р м а н о в і ч Язэп Станіслававіч; 4.3.1890, в. Гальшаны Ашмянскага р-на — 26.12.1978), беларускі пісьменнік, рэлігійны дзеяч. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю (1913). Працаваў ксяндзом на Беласточчыне, у Друі. У 1924 уступіў у ордэн марыянаў. У выніку ганенняў польск. улад у 1932 выехаў у Харбін (Кітай), дзе выконваў абавязкі дырэктара гімназіі, у 1936 вярнуўся ў Вільню, адтуль выселены ў Польшчу, потым зноў у Харбіне. У 1948 арыштаваны, перададзены ў СССР, дзе асуджаны на 25 гадоў прымусовых работ у папраўча-прац. лагерах. Пасля вызвалення ў 1955 выехаў у Польшчу, потым у Італію, Англію, дзе рэдагаваў час. «Божым шляхам». Вял. ўплыў на літ. дзейнасць пісьменніка аказалі творы **Ф.**Багушэвіча, В.Дуніна-Марцінкевіча, М.Гарэцкага. Аўтар празаічнай гутаркі «Як Казюк сабраўся да споведзі» (1928), апавядання «Як Ганулля збіралася ў Аргенціну» (1930), аповесці «Хлопец» (1935), успамінаў «Кітай—Сібір—Масква» (1962), гумарыст. і сатыр. вершаў для дзяцей, зб. вершаў «Беларускія цымбалы» (Вільня, 1933), «Байкі і іншыя вершы» (Лондан, 1973) і інш.

**АДВАРО́ТНЫ СЛО́ЎНІК**, і н в е р с і й н ы с л о ў н і к, лексікаграфічнае выданне рэестравага тыпу, у якім словы размяшчаюцца па алфавіце канцавых літар. Выраўноўванне адбываецца па правым краі. У выніку такой будовы ў А.с. групуюцца, як правіла, словы з тоеснымі або падобнымі канцавымі граматычнымі і фанетычнымі элементамі (напр., на літару «А»:

«радовішча»,
«віловішча»,
«зімовішча»,
«становішча»,
«вандровішча»,
«сховішча»
і інш.).

Асобныя кампактныя групы ўтвараюць словы з аднолькавымі канчаткамі, суфіксамі, аднатыпнымі гукамі і іх спалучэннямі. Часам у А.с. могуць указвацца стыліст. характарыстыкі слоў («ласкальнае», «кніжнае», «размоўнае», «устарэлае» і пад.), а таксама пазначацца графічная, акцэнтуацыйная, фанетычная, граматычная варыянтнасць лексем («сяголета» і «сёлета», «льносушылка» і «лёнасушылка»). З дапамогай А.с. можна ўстанавіць існуючыя тыпы скланення і спражэння, вызначыць ступень пашыранасці тых ці інш. словаўтваральных і словазмяняльных тыпаў, прааналізаваць прадуктыўнасць пэўнай словаўтваральнай мадэлі, выявіць матэрыял для фанетычных даследаванняў. А.с. выкарыстоўваецца пры дэшыфроўцы тэкстаў і складанні праграм для іх камп'ютэрнай апрацоўкі. Лексіку бел. мовы фіксуюць: «Адваротны слоўнік сучаснай беларускай мовы» А.Барташэвіча і І.Камендацкай (т. 1—4, 1988—89), які падае каля 100 тыс. слоў з акадэмічнага «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы» (т. 1—5, 1977—84), «Адваротны слоўнік беларускай мовы» Л.М.Вардамацкага і В.І.Несцяровіча (1994). *Дз.В.Дзятко.*

**АДВЕ́ДКІ**, в о д в е д к і, а д в е д з і н ы, традыцыйны звычай наведваць парадзіху, каб дазнацца, як яе самаадчуванне і ці здарова дзіця, а таксама, каб дапамагчы ў хатніх клопатах. У А. прыходзілі жанчыны праз дзень-два пасля родаў. Мужчынам і незамужнім дзяўчатам хадзіць у А. было забаронена. Кожная жанчына несла з сабой у клуначку ці місачцы (таму на Магілёўшчыне гэты звычай называецца «пайсці з міскай») печыва, што-небудзь варанае, бліны, сыр, мёд, масла, на Палессі яшчэ і боршч, варэнікі, кампот з сушаных ягад (узвар). Наведвальніц частавалі, запрашалі на *радзіны.* Звычай А. ўзнік у першабытным грамадстве, у Беларусі з некаторымі зменамі захаваўся да нашага часу. Сёння ў А. ходзяць не толькі жанчыны, але і мужчыны, і незамужнія дзяўчыны. З сабой яны звычайна прыносяць падарункі дзіцяці.

**АДВЕНТЫ́СТЫ** (ад лац. adventus прышэсце), паслядоўнікі хрысціянскай пратэстанцкай плыні. Прапаведуюць хуткае другое прышэсце Хрыста, якім завяршыцца адвечная барацьба Бога і сатаны, уваскрэсенне праведнікаў да вечнага жыцця, пекла для грэшнікаў. Маюць некалькі галін, сярод якіх найб. пашыранай з'яўляецца абшчына А. сёмага дня (АСД), што святкуюць суботу як дзень духоўнай бадзёрасці, прысвечанай малітве

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

(дзень «адпачынку Бога» пасля 6 дзён працы над стварэннем свету).

Вучэнне А. узнікла ў сярэдзіне 19 ст. ў ЗША. У бел. губернях Рас. імперыі яны з'явіліся ў канцы 19 — пач. 20 ст. ў выніку дзейнасці замежных прапаведнікаў. Першая адвентысцкая абшчына была зарэгістравана ў 1910 у Вільні, у 1913 — у Мінску на чале з Г.Лебсакам, гал. арганізатарам адвентызму на тэр. Расіі. У перыяд паміж 1-й і 2-й сусв. войнамі дзейнічалі абшчыны ў Зах. Беларусі, у асн. на Палессі. У 2-й пал. 20 ст. абшчыны АСД разгарнулі актыўную дзейнасць. Рэліг. аб'яднанне «Беларуская канферэнцыя адвентыстаў сёмага дня» ўваходзіць у еўразійскае аддз. Сусв. царквы хрысціян АСД. У 1994 у Мінску быў адкрыты філіял Заокскай духоўнай акадэміі АСД (Расія). На 1.1.2009 у Беларусі дзейнічалі 72 абшчыны АСД.

*Літ.*: Гурко А.В. Конфессиональная ситуация в Республике Беларусь: этнич. и историч. аспекты. Минск, 2001; Современная религиозная жизнь России. Опыт систематического описания. М., 2003.

*В.Р.Языковіч.*

**АДДЗЕЛАЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ** ў будаўніцтве, матэрыялы і вырабы, якія выкарыстоўваюцца з мэтай паляпшэння розных тэхн. рэжымаў эксплуатацыі будынкаў і збудаванняў (санітарна-гігіенічных, тэхнал. і інш.), павелічэння тэрмінаў службы буд. канструкцый, павышэння архіт. выразнасці будынка і яго інтэр'ера, а таксама для ўнутранай і вонкавай аддзелкі сцен, цокаляў, запаўнення светлавых праёмаў, абсталявання святлопрапускальных сцен і перагародак, пакрыцця падлог і столі рознай канструкцыі, агароджаў балконаў і лоджый. Традыц. і сучасныя А.м. ў архіт.-буд. практыцы Беларусі вызначаюць архіт.-маст. аблічча будынкаў, збудаванняў, гарадоў. Па функцыянальным прызначэнні адрозніваюць А.м.: звычайныя, спец. (акустычныя, цепла-, гідра-, электраізаляцыйныя, хімічнаўстойлівыя, гарачатрывалыя, антыкаразійныя, рэнтгенаабарончыя і інш.), дэкар. і архіт.-маст. (барэльефы, архіт.-ляпныя ўпрыгажэнні, мазаіка, вітражы, маст. роспіс і інш.). У працэсе выкарыстання А.м. фарміруецца вонкавы пласт, у якім прымяняюцца вадкія і пластычныя матэрыялы (лакі, фарбы, пасты, мастыка, раствор) і вырабы з гатовай вонкавай паверхняй (рулонныя, ліставыя, плітныя і пліткавыя, штучныя, фасонныя, прафіляваныя, плоскія даўгамерныя). Вонкавы пласт на паверхні канструкцыйных элементаў будынкаў можа быць выкананы ў заводскіх умовах з поўнай гатоўнасцю ў працэсе вырабу альбо непасрэдна падчас ці пасля заканчэння мантажу будынка.

Традыц. ў Беларусі з'яўляліся А.м. з драўніны, якая здаўна шырока выкарыстоўвалася ў нар., сядзібным і культавым будаўніцтве ў выглядзе розных дэталей дэкарыравання фасада, вокнаў, дзвярэй, франтонаў і інш. (сцены і карніз у *Поразаўскай сядзібе*; іканастас і паліхромная драўляная скульптура ў *Кажан-Гарадоцкай Мікалаеўскай царкве*). У наш час пашырыўся дыяпазон прымянення А.м. з драўніны ў аддзелцы інтэр'ераў

*Да арт.* ***Аддзелачныя матэрыялы.*** *Капліца-пахавальня з мазаічным пано на фасадзе ў г.п. Мір Карэліцкага р-на.*



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ